# Помню Хоцімска раніцы...

**Помню Хоцімска раніцы,**
**Дрэвы, росамі ўмытыя.**
**Тут у маці-настаўніцы**
**Наш пясняр знакаміты жыў.**

**П. ПРЫХОДЗЬКА "Маім землякам".**

Мой аповед пра "Дзве мае маленькія Радзімы ўсходні Елавец (на Хоцімшчыне) і заходні Рамель (на Століншчыне)" – быў змешчаны ў часопісе "Беларусь" №10/2001 г. Хоць дзесяткі год жыву на Брэстчыне, ды выкарыстоўваю малейшую магчымасць пабыць на Магілёўшчыне, у Хоцімску і вёсцы майго дзяцінства Елаўцы, дзе мяне вучыла ў сямігодцы маці Аркадзя Куляшова – Кацярына Фамінічна Ратабыльская, да якой наведваўся класік беларускай літаратуры. У Елаўцы жывуць сем'і маіх старэйшых сястры Анастасіі і брата Васіля, на мясцовых кладах пакоіцца прах бацькоў. Быў на сваёй усходняй Радзіме ў 2000-ым годзе, завітаў сюды і на пачатку вясны 2002-га.

У Хоцімску наведаў рэдакцыю раённай газеты "Шлях Кастрычніка", дзе было надрукавана некалькі маіх матэрыялаў. Быў засмучаны заўчаснай смерцю былога галоўнага рэдактара Дзмітрыя Ягоравіча Лапцеўскага. Ды жыццё працягваецца, пра што расказалі новы кіраўнік раёнкі Ларыса Іванаўна Даніленка і адказны сакратар Наталля Іванаўна Кацяшова. Адбылася цёплая сустрэча з супрацоўнікамі цэнтральнай раённай бібліятэкі, якой перадаў новы верш Пятра Прыходзькі, які нідзе не друкаваўся, "Варонняя зона" з аўтографам паэта. Завітаў да сястры па бацьку Аркадзя Куляшова – Антаніны Аляксандраўны Пырх (у літаратуразнаўчым эсэ "Лясному рэху праўду раскажу... " на старонцы 121 пра яе ўспамінае дачка паэта Валянціна Куляшова). Антаніна Аляксандраўна выхоўвала дзяцей і цяпер на адпачынку, спявае ў народным хоры ветэранаў вайны і працы. Яна падзялілася ўспамінамі пра Куляшовых, паказала сямейны альбом. Яна ж паведаміла, што Аркадзь Куляшоў памёр праз тры месяцы пасля пахавання бацькі. З ёю пабыў у ваколіцы Хоцімска на могілках, дзе спачываюць Кацярына Фамінічна і Аляксандр Мікала-

евіч, усклалі цюльпаны на іх магілы. Радасна-шчымлівай была сустрэча ў невялікім доміку ля Беседзі па вуліцы Гагарына, 5. Тут жылі родная цётка і дзядзька Пятра Прыходзькі – Наталля Ігнацьеўна і Максім Савельевіч Прыходзькі, у якіх я кватараваў тры гады, калі вучыўся ў 8-10 класах Хоцімскай сярэдняй школы. Цяпер тут жыве іх пляменнік Іван Віктаравіч Холалаў, бамавец, уладальнік двух дыпломаў вышэйшай адукацыі. Пахадзіў па "сваім" пакойчыку, пасядзеў на "сваёй" канапе, на якой паўстагоддзя таму рыхтаваў урокі. З гаспадаром падзяліліся ўспамінамі, паглядзелі сямейны альбом фотаздымкаў Прыходзькаў. Як водзіцца, прадэгусціравалі клімавіцкі "Люкс". Пераканаліся – прадукцыя выдатная, незадарма ж пра Клімавіцкі ЛГЗ у СМІ апошнім часам было столькі сказана...

Прайшоўся па Альшову – роднай вёсцы Пятра Прыходзькі. Тут, як і ў Хоцімску, яго ведаюць, ім ганарацца. А як жа інакш: у мінулым годзе Пятро Фёдаравіч парадаваў землякоў (як і ўвогуле Беларусь і Магілёўшчыну) новым цудоўным зборнікам вершаў, балад і паэм "Позняя восень" і асобна выдадзенай гістарычнай паэмай "Дар князёўны", дзе столькі сказана цёплых слоў пра Альшоў і Ліпаўку, Елавец і Хоцімск, іх насельнікаў, пра радзімую Беседзь. Некалі на пасадзе адказнага сакратара Хоцімскай раённай газеты пачынаў свой творчы шлях будучы паэт. Цяпер ён старэйшына беларускай паэзіі, аўтар каля трыццаці паэтычных зборнікаў, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова. Нездарма ж адзін дасведчаны хацімчанін "па сакрэту" паведаміў, што плануецца адной з вуліц райцэнтра надаць імя Пятра Прыходзькі. Паслухаў, як "...шуміць шаша шуршаннем колаў шынных і аж уздрыгвае пад гул машынны наведзены праз Беседзь новы мост" (прыходзькаўская цытата) у Хоцімску. Зазірнуў у краязнаўчы музей, пагутарыў з яго дырэктарам Іванам Іванавічам Казловым. На жаль, агледзець экспанаты музея не пашанцавала: супрацоўніцы з ключамі па справах пайшлі да банка, а мяне "падціскаў" час ад'езду. Дарэчы, музей адчынены дзякуючы Магілёўскаму губернатару Б.В. Батуру і раённай "вертыкалі", перад якімі хадайнічаў Паважаны Пятро Прыходзька. Ад імя і па просьбе дырэктара музея праз друк звяртаюся да ўсіх жыхароў Хоцімшчыны і Магілёўшчыны: дапамажыце хто чым можа экспанатамі для музея, зрабіце яго такім жа прыгажуном як і ваш Сабор Святой Троіцы, чароўным перазвонам званоў якога я захапляўся, схіліўшы нізка галаву перад уваходнай брамай.

Здаецца, задужа мы сёння плачамся-скардзімся на цяжкасці жыцця. Яны, безумоўна, ёсць. Але ў параўнанні з мінулым яны – нішто. Некалі пасля вайны з сябрам Віктарам Івандзікавым мы штодзень топалі пешкам з Елаўца да Хоцімска ў школу па бездаражы: пяць кіламетраў Елавец – Альшоў – Хоцімск, і столькі ж назад. Цяпер вёску з райцэнтрам злучае асфальтаваная дарога, вучняў прывозіць – адвозіць спецыяльны аўтобус. Школьнікі адзеты – абуты не горш за гарадскіх, накормлены. З вучнямі і я пад'ехаў да школы, сустрэўся з вядомым настаўнікам-краязнаўцам Віктарам Міхайлавічам Крывіцкім. Ён падарыў сваю брашуру з аўтографам – вучэбны дапаможнік "Ге-

аграфія Хоцімскага раёна", якая тысячным тыражом выпушчана ў мінулым годзе Магілёўскай абласной узбуйнённай друкарняй. Падумалася: узорны прыклад беражлівых адносін да родных мясцін паказаў таленавіты аматар-настаўнік Хоцімшчыны!

...І зноў Елавец – Хоцімск – Камунары, затым Крычаў – Магілёў. Па дарозе ў акно вагона дыхнула дымам вялізная труба "экалагічна-чыстага" прадпрыемства – Касцюковіцкага цэментнага завода. Ды, як сказаў класік "...і дым Айчыны нам салодкі і прыемны"...

Зноў дзень добры, Століншчына! Прымі шчырае прывітанне ад усходняга "фарпоста" краіны –Хоцімшчыны!

**Леанід РАМАНЕНКА, выдатнік народнай адукацыі.**

**Раманенка, Л. Помню Хоцімска раніцы…** : [пра візіт на радзіму паэта-земляка] / Леанід Раманенка // Шлях Кастрычніка. — 2002. — 25 мая. — С.2.